**К. А. Скур'ят,** *саіскальнік вучонай ступені кандыдата навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».*
Навуковы кіраўнік – **А. М. Нароўская,** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# КАМПАРАТЫЎНЫ АНАЛІЗ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ КУЛЬТУРЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ (ТАТАРАЎ І ЯЎРЭЯЎ) СРОДКАМІ ДЗЯРЖАЎНЫХ МУЗЕЯЎ БЕЛАРУСІ

Многія музеі Рэспублікі Беларусь захоўваюць у калекцыях прадметы духоўнай і матэрыяльнай культур яўрэйскага і татарскага народаў, якія выкарыстоўваюцца ў экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці музеяў.

Сярод даследчыкаў, якія вывучаюць культуру беларускіх яўрэяў і татараў, вылучаюцца Л. Л. Смілавіцкі [12], Э. Г. Іофэ [6], А. В. Гурко [4], З. І. Канапацкая [7], А. І. Лакотка [8] і інш.

Яскравым прыкладам музея, у пастаяннай экспазіцыі якога прадстаўлены прадметы яўрэйскай і татарскай культур, з'яўляецца Мінскі абласны краязнаўчы музей.

Прадметы абедзвюх культур знаходзяцца ў раздзеле, прысвечаным канфесіям мясцовага насельніцтва.

Рытуальны падсвечнік, упрыгожаны зоркай Давіда, а таксама мезуза (кавалак пергаменту з урыўкамі з Торы ў футляры з дрэва, металу ці шкла), якую прымацоўваюць у верхняй трэці правага дзвярнога вушака яўрэйскага жылля, захоўваюцца як прадметы, што належалі яўрэйскаму насельніцтву.

Сярод прадметаў татарскай культуры – хамаіл (малітвеннік) XIX ст., тасбіх (ружанец мусульманскі) і 2 мугіры (дываны з выявамі вядомых мячэцей) [10].

Адной з сучасных тэндэнцый з'яўляюцца музеі, адкрытыя на базе храмаў. Так, у 2012 г. у будынку Вялікай харальнай сінагогі, што ў цэнтры г. Гродна, створаны Музей гісторыі яўрэяў, экспазіцыя якога прысвечана вядомым яўрэям – ура-

джэнцам горада і знішчэнню яўрэйскага насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У 2019 г. у Мінскай саборнай мячэці адкрыты першы на тэрыторыі рэспублікі Музей ісламу. Мячэць стала першым культавым збудаваннем мусульман Беларусі з каменю (1900) і мае выключнае значэнне для беларускіх татараў. У музейную экспазіцыю ўвайшлі сабраныя як у краіне, так і за яе межамі прыналежныя беларускім мусульманам прадметы: Каран і кітабы, гербы татарскіх шляхецкіх родаў, адзенне імама XIX ст. [1].

Найбольш поўна сярод дзяржаўных музеяў Рэспублікі Беларусь культура татараў і яўрэяў раскрыта ў Іўеўскім музеі нацыянальных культур, заснаваным у 2009 г. Пастаянная экспазіцыя падзелена на тры часткі – «Беларускія татары», «Беларускія яўрэі», «З гісторыі карэннага насельніцтва Іўеўшчыны». Першыя дзве часткі структурна падобныя гісторыяй паяўлення двух этнічных груп на беларускіх землях, іх рэлігіямі, святымі кнігамі, прадметамі культу, побытам, святамі і інш.

Так, у цэнтры часткі экспазіцыі, прысвечанай татарам, – адноўлены макет Іўеўскай драўлянай мячэці, дзякуючы якому наведвальнікі знаёмяцца з яе ўнутраным убраннем. У частцы экспазіцыі «Беларускія яўрэі» аб’ёмная фігура равіна ўстаноўлена на спецыяльным узвышэнні (біме) у цэнтры.

У экспазіцыі прадстаўлена шмат рэчаў пераважна рэлігійнага характару, усебакова адлюстроўваючых жыццё яўрэйскага і татарскага насельніцтва: таджвід (правілы чытання Карана) 1970 г., джуба (рытуальнае адзенне імама), яд (указка для чытання Торы); хамса (амулет у форме далоні). На сталах размяшчаюцца муляжы страў з нацыянальнай кухні [5].

Галоўным адрозненнем з’яўляецца наяўнасць у экспазіцыі часткі, прысвечанай ваеннай справе татараў, паколькі значная іх колькасць несла ваенную службу ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Асноўнымі ж заняткамі яўрэйскага насельніцтва былі гандаль і рамесніцтва, таму для адлюстравання традыцыйна-бытавой дзейнасці яўрэяў выкарыстоўваецца інсталяцыя часткі мястэчковай забудовы яўрэйскага жылля.

У час правядзення тэатралізаванай агляднай экскурсіі «Іўе скрозь прызму стагоддзяў» для лепшага засваення матэрыялу наведвальнікам прапануюць прыняць удзел у сюжэтна-ролевай гульні аб паяўленні татараў на тэрыторыі беларускіх зямель і рэканструкцыі старажытнага яўрэйскага танца.

Культура яўрэяў і татараў дэманструецца таксама на часовых выставах. Так, у Доме-музеі I з'езда РСДРП (філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь) з 5 лютага па 3 красавіка 2016 г. на выставе «Зброя і гонар. Татары на службе ВКЛ» акрамя ўзбраення прадставілі прадметы татарскага побыту і традыцыйнае адзенне [9].

Варта адзначыць сумесныя выставы музеяў Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Татарстан. Так, у 2018 г. Елабужскі дзяржаўны музей-запаведнік правёў серыю выстаў «Многоцветие татарской культуры» ў Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку, Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь і Гомельскім палацава-паркавым ансамблі. У экспазіцыі паказаны ўзоры татарскага нацыянальнага касцюма і прадметы інтэр'ера [11].

Яўрэйская тэматыка часцей за ўсё закранаецца на часовых выставах, прысвечаных палітыцы генацыду на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У большасці такіх экспазіцый знаходзіцца раздзел, у якім ушаноўваецца памяць ахвяр Халакосту.

Дэманстрацыя бытавой культуры яўрэяў ускладняецца тым фактам, што многія яе прадметы вывезены падчас нямецка-фашысцкай акупацыі [3, с. 30]. Так, амаль цалкам знік збор прадметаў яўрэйскай культуры Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Сёння вернута больш сотні прадметаў з даваеннага збору, якія можна было ўбачыць на часовай выставе «Другое рождение. Реконструкция еврейской коллекции Белорусского государственного музея 20–30-х гг. XX века». Сярод унікальных прадметаў – калекцыя тасаў (шчыткі для скруткаў Торы) XIX ст., ханукальная свяцільня XVIII ст., заручальны пярсцёнак XIX ст. з верхавінай у выглядзе стылізаванага дома або храма і г. д. [2].

Такім чынам, яўрэйская і татарская культуры ў дзяржаўных музеях Рэспублікі Беларусь у асноўным дэманструюцца ў раздзелах экспазіцыі і выстаў, прысвечаных рэлігіі. Матэрыяльная культура яўрэяў таксама адлюстроўваецца і на часовых выставах, якія прадстаўляюць побыт насельніцтва, а таксама паказваюць акупацыйную палітыку генацыду ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Акцэнт выстаў, прысвечаных татарам, робіцца на іх ваеннай справе і матэрыяльнай культуры. Найбольш

поўна і ўсебакова з культурай беларускіх яўрэяў і татараў можна пазнаёміцца ў Іўеўскім музеі нацыянальных культур.

*1.* В Минской соборной мечети открыли Музей ислама [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://minsk.gov.by/ru/news/new/2019/12/06/2829/. – Дата доступа: 06.02.2024.

*2.* Выставка, посвященная еврейской культуре, откроется в Национальном историческом музее [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://minsknews.by/vystavka-posvyashhennaya-evrejskoj-kulture-otkroet-sya-v-naczionalnom-istoricheskom-muzee/. – Дата доступа: 28.02.2024.

*3. Гужаловский, А. А.* Белорусские музеи в период Великой Отечественной войны / А. А. Гужаловский // Вопр. музеологии. – 2018. – Т. 9. – Вып. 1. – С. 27–38.

*4. Гурко, А. В.* Яўрэі / А. В. Гурко // Беларусь. Этнічныя супольнасці / пад навук. рэд. А. В. Гурко. – Мінск, 2017. – С. 80–95. – (Беларусь сучасная.)

*5.* Ивьевский музей национальных культур. Белорусские татары [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ivye-museum.by/belorusskie-tatary/. – Дата доступа: 02.06.2024.

*6. Иоффе, Э. Г.* Страницы истории евреев Беларуси : краткий науч.-популяр. очерк / Э. Г. Иоффе. – Минск : АРТИ-ФЕКС, 1996. – 294 с.

*7. Канапацкая, З. І.* Фарміраванне татарскіх паселішчаў на тэрыторыі Беларусі ў XIV–XVII стст. / З. І. Канапацкая // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. – 2005. – № 1. – С. 29–33.

*8. Лакотка, А. І.* Бераг вандраванняў, ці Адкуль у Беларусі мячэці / А. І. Лакотка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 95 с.

*9.* «Оружие и Честь. Татары на службе ВКЛ» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ucp.by/university/news/novosti-universiteta/oruzhie-i-chest-tatary-na-sluzhbe-vkl/. – Дата доступа: 01.02.2024.

*10.* Постоянная экспозиция «История Минщины с древнейших времен до начала XX в.» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://molodechno-mokm.museum.by/node/46288. – Дата доступа: 06.02.2024.

*11.* 5 июня в Минске открывается выставка «Многоцветие татарской национальной культуры» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/5-iyunya-v-minske-otkryvaetsya-vystavka-mnogotsvetie-tatarskoy-natsionalnoy-kultury-iz-fonda-elabuzh.html. – Дата доступа: 01.02.2024.

*12. Смиловицкий, Л. Л.* Катастрофа евреев в Белоруссии: 1941–1944 гг. / Л. Л. Смиловицкий. – Тель-Авив : Б-ка Матвея Черного, 2000. – 416 с.